падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для бібліятэчна-інфармацыйных устаноў краіны.

Кузьмініч М.Л., дацэнт

## ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА Ў СІСТЭМЕ МАСТАЦКА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Адным з перспектыўных накірункаў дзейнасці Беларускага універсітэта культуры з'яўляецца падрыхтоўка педагагічных кадраў для сферы мастацкай культуры.

Авалоданне тэхналогіяй выхавання вучняў сродкамі пэўнага віду мастацтва немагчыма без глыбокага ведання тэарэтычных дысцыплін, прадстаўленых цяпер у вучэбным плане. Гэта, з аднаго боку, прадметы псіхолага-педагагічнага цыкла: псіхалогія (агульная, сацыяльная, узроставая, педагагічная, мастацкай творчасці), педагогіка (агульная і прафесійная — музычная, тэатральная), методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін. З другога боку, гэта прадметы, што забяспечваюць мастацка-прафесійную падрыхтоўку спецыялістаў. Метадалагічную аснову прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі будучыя спецыялісты атрымліваюць у час вывучэння філасофскіх прадметаў, найперш эстэтыкі. Імкненне выкладчыкаў развіць у студэнтаў педагагічныя здольнасці, уменні, навыкі, сфарміраваць педагагічнае ўмельства — аснову педагагічнага майстэрства — рэалізуецца ў распрацоўцы і наступным уводзенні ў вучэбны план новых прадметаў: прыватных методык, спецыяльных курсаў, семінараў, практыкумаў, факультатываў і г.д. У педагагічных ВНУ чытаюцца такія прадметы, як "Уводзіны ў выкладчыцкую спецыяльнасць", "Агульная методыка вучэбнай работы", "Гісторыя педагогікі", "Асновы педагагічнага майстэрства", "Метадалогія і методыка педагагічных даследаванняў", "Псіхолага-педагагічныя асновы эстэтычнага выхавання", "Методыка арганізацыі мастацка-творчай дзейнасці вучняў", "Асновы сямейнай педагогікі і методыка работы з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бацькамі", "Сацыяльная педагогіка", "Педагагічная этыка", "Вопыт педагогаў-наватараў","Камп'ютэрная псіхадыягностыка", "Тэхнічныя сродкі навучання", "Трэнінг педагагічных зносін", "Культура мовы", "Узроставая фізіялогія і гігіена" і інш.

Важным накірункам навукова-метадычнай працы выкладчыкаў з'яўляецца ўдасканаленне зместу, сродкаў, форм, метадаў асобных прадметаў псіхолага-педагагічнага цыкла, і асабліва арганізацыя і правядзенне педагагічнай практыкі. Увагі патрабуюць літаральна ўсе аспекты практычнай падрыхтоўкі педагогаў: удакладненне задач, зместу, формаў кіраўніцтва, крытэрыяў ацэнкі вынікаў практыкі; навукова-даследчая работа студэнтаў у гэты перыяд; працягласць этапаў практыкі, забеспячэнне пераемнасці паміж імі; бесперапыннасць практыкі. Педагагічная практыка павінна развіць у студэнтаў разуменне мэты педагагічнай дзейнасці, веданне вучнем сістэмнага педагагічнага, сацыяльнага ўздзеяння на асобу, прывесці да авалодання сродкамі яе фарміравання, спосабамі выкарыстання іх у мастацкай творчасці. Формы правядзення практыкі мадэліруюць карціну дзейнасці выкладчыка. Яе прадметамі з'яўляюцца змест дысцыпліны, пазнавальная актыўнасць навучэнцаў, яе арганізацыя. Задачы педагагічнай практыкі вымагаюць адзінства дзеянняў усіх кіраўнікоў — псіхолага, педагога, метадыста, прадметніка і інш.

Сярод шляхоў удасканалення педагагічнай падрыхтоўкі арганізатараў мастацкай творчасці можна назваць наступныя:

1. Распрацоўка сістэмы мастацка-педагагічных задач, вырашаемых спецыялістам, а таксама пераліку неабходных уменняў, стварэнне вучэбнай мадэлі тэхналогіі прафесійнай дзейнасці, увасабленне яе ў курсах прыватных методык, педагагічнай практыкі. На занятках па методыцы выкладання студэнты наведваюць заняткі вопытных педагогаў, аналізуюць іх, праводзяць урокі розных тыпаў або іх фрагменты, у тым ліку ў форме дзелавой гульні. Гэта павінна забяспечваць фарміраванне ўменняў:

— вызначаць мэты ўрокаў, пазакласных мерапрыемстваў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— ставіць пазнавальныя задачы, планаваць урокі розных тыпаў, іх тэматычную накіраванасць;

— адбіраць дыдактычны, рэпертуарны, інструктыўны матэрыял;

— вызначаць суадносіны відаў працы на ўроках;

— апытваць, правяраць дамашнія заданні;

— весці дэдуктыўна і індуктыўна пабудаваную гутарку, тлумачэнне матэрыялу, замацоўваць веды, выпрацоўваць уменні, навыкі;

— аналізаваць урокі, выхаваўчыя мерапрыемствы, планаваць матэрыял, складаць канспекты ўрокаў;

— арганізоўваць зносіны з вучнямі, забяспечваць міжпрадметныя сувязі, прагназаваць паводзіны, устанаўліваць зваротныя сувязі на ўроку;

— дыягнаставаць развіццё здольнасцей і інш..

Дзелавыя гульні ў курсе методыкі ахопліваюць тэмы, дзейнасць на ўроку, пазакласную работу, метады педагагічных даследаванняў. Па курсе методыкі студэнты пішуць пяць-шэсць планаў-канспектаў урокаў розных тыпаў. Выкладчыкі арганізуюць паказ узораў педагагічнай дзейнасці, "прайграванне" ўрокаў, выхаваўчых мерапрыемстваў.

2. Удасканаленне практыкі напісання і абароны курсавой работы па педагогіцы. Павышэнне эфектыўнасці навучальнага працэсу вымагае вырашэння шэрагу арганізацыйных пытанняў.

Тэма курсавой работы зацвярджаецца ў час вывучэння курса педагогікі (5—6 семестры). Студэнт чытае літаратуру, рыхтуецца да эксперымента, робіць яго тэарэтычнае абгрунтаванне, прадстаўляе на экзамен па педагогіцы першую главу работы.

У 7—8 семестрах ён вывучае педагагічны вопыт, праводзіць канстатуючую частку эксперыментальнай работы ў час педагагічнай практыкі без адрыву ад навучальнага працэсу, выкарыстоўвае матэрыял лабараторных работ па методыцы выкладання. Кантроль за выкананнем курсавой работы даручаецца выкладчыкам прыватных методык, кіраўніку практыкі ад кафедры. У 8 семестры лепшыя студэнты



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зацвярджаюць тэмы дыпломнай працы на атрыманне ступені бакалаўра. Тэма дыпломнай працы можа адпавядаць тэме курсавой работы.

У 9 семестры праводзіцца педагагічны эксперымент па тэме курсавой (дыпломнай) работы падчас 12-тыднёвай практыкі з адрывам ад навучальнага працэсу. Работа афармляецца належным чынам, прадстаўляецца на рэцэнзію.

Абарона курсавой работы праводзіцца на базе практыкі альбо ў час канферэнцыі па выніках педагагічнай практыкі. У асобных выпадках мэтазгодна сумяшчаць абарону курсавых і дыпломных работ, у тым ліку на званне бакалаўра. Патрабуюць вывучэння, апрабацыі прапановы аб увядзенні дзяржаўнага экзамену па педагагічнай практыцы, у тым ліку ў форме абароны курсавых работ; сумяшчэнне дзяржаўнага экзамену па педагогіцы, методыцы выкладання з абаронай курсавых і дыпломных работ і інш.

3. Удасканаленне змястоўных і арганізацыйных аспектаў правядзення педагагічнай практыкі. Накірункамі даследчыцкай працы тут становяцца вызначэнне агульных і прамежкавых (этапных) мэт і задач педагагічнай практыкі, удакладненне зместу кожнага этапу; удасканаленне форм кіраўніцтва, справаздачнасці, крытэрыяў ацэнкі. У педагагічных колах усталёўваецца думка, што аналізаваць трэба якасць работы практыканта, узровень развіцця яго педагагічных здольнасцей, асобныя якасці, мастацка-педагагічныя ўменні, навыкі выкладання, вядзення эксперыментальнай работы, выхавання, развіцця вучня, а таксама адпаведнасць студэнтаў прафесійна-педагагічным патрабаванням.

4. Змястоўная шматаспектнасць педагагічнай практыкі, як усёй мастацка-педагагічнай дзейнасці ўвогуле, вымагае прыцягнення да кіраўніцтва ёю вялікай колькасці спецыялістаў. Гэта кіраўнік відамі практыкі ва універсітэце, факультэцкія кіраўнікі, кіраўнікі спецыялізацый, метадысты (адпаведна колькасці музычных інструментаў у музыкантаў-інструменталістаў і інш.), выкладчык-прадметнік на базе практыкі, намеснік дырэктара школы па эстэтычным выхаванні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ці выхаваўчай рабоце, педагог і псіхолаг з кафедры педагогікі і псіхалогіі. Калі ўлічыць, што гэтыя спецыялісты працуюць на розных кафедрах, нават у розных установах, маюць неаднолькавыя падрыхтоўку, погляды на мэты, змест, метады кіравання практыкантамі, то стане відавочнай актуальнасць вырашэння праблемы аб'яднання іх намаганняў. Гэта магчыма ажыццявіць шляхам распрацоўкі метадычнай дакументацыі (праграмы педагагічнай практыкі і інш.). Там будуць прадстаўлены іерархія мэт, задач, зместу педагагічнай практыкі, функцыянальныя абавязкі кожнага ўдзельніка навучальнага працэсу і г.д. У арганізацыйным плане варта было б: зменшыць колькасць кіраўнікоў практыкі (кіраўнік вядзе практычныя заняткі па педагогіцы, псіхалогіі, методыцы выкладання, працуе ў базавай школе); утварыць выпускаючую кафедру псіхалогіі і педагогікі, сканцэнтраваць на ёй усе псіхолага-педагагічныя прадметы, методыкі практыкі. Для выпрацоўкі агульных падыходаў да арганізацыі і правядзення педагагічнай практыкі з боку шматлікіх яе кіраўнікоў яны павінны наведваць лекцыі па сучасных праблемах педагогікі, псіхалогіі, методыкі выкладання, заняткі па прыватных методыках з наступным аналізам, абмеркаваннем; удзельнічаць у правядзенні тэарэтыка-метадычных семінараў, установачных выніковых канферэнцый, у зборы, абагульненні, распаўсюджанні перадавога вопыту.

5. Эфектыўнасць педагагічнай практыкі залежыць ад узроўню яе арганізаванасці, выяўлення пераемнасці ў змесце этапаў, эфектыўнасці формаў кантролю, прадуманасці ўстановачнай, справаздачнай канферэнцый. Пачатку педагагічнай практыкі могуць папярэднічаць наступныя мерапрыемствы: спецыяльныя практыкумы па авалоданні рознымі формамі навучальнай, пазакласнай работы; псіхолага-педагагічныя трэнінгі, наведванне, "прайграванне", аналіз урокаў, пазакласных мерапрыемстваў; семінары па азнаямленні з інструктыўна-метадычнымі матэрыяламі па практыцы, навукова-метадычныя сустрэчы, "круглыя сталы", канферэнцыі выкладчыкаў, дырэктараў дзіцячых музычных школ і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У час установачнай канферэнцыі адбываецца знаёмства з адміністрацыяй базы практыкі, кіраўнікамі аддзяленняў, настаўнікамі. Вызначаецца і праграма дзейнасці практыкантаў. Студэнты атрымліваюць уяўленне пра задачы, змест практыкі, арганізацыю кансультавання практыкантаў, дакументы да справаздачы, крытэрыі ацэнкі практыкі.

Педагагічная практыка на мастацкіх спецыялізацыях Беларускага універсітэта культуры праводзіцца ў 7—9 (10) семестрах адначасова з пачаткам вывучэння прыватных методык. Мэтазгодна, каб асноўныя этапы практыкі адпавядалі названым семестрам, мелі сэнсавае напаўненне, адлюстраванае ў заданнях для студэнтаў, заканчваліся справаздачамі практыкантаў. Удакладненне зместу кожнага этапу практыкі — адзін з накірункаў даследавання мастацка-педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Арганізацыйная мадэль педагагічнай практыкі, якая ўсталявалася ў нашым універсітэце, уключае некалькі этапаў.

I этап, 7 семестр:

— верасень — установачная канферэнцыя;

— кастрычнік — азнаямляльная педагагічная практыка з адрывам ад навучальнага працэсу (4 тыдні);

— лістапад—снежань — вучэбная педагагічная практыка без адрыву ад навучальнага працэсу (10 тыдняў);

— студзень — першая рубежная абарона педагагічнай практыкі.

У гэты перыяд студэнты прыступаюць да вывучэння прыватных методык. У час азнаямляльнай практыкі яны знаёмяцца з Палажэннем аб школе, вучнямі, выкладчыкамі, адміністрацыяй; з вучэбнымі планамі, праграмамі, іншай дакументацыяй, раскладам заняткаў; функцыянальнымі абавязкамі выкладчыка, загадчыка навучальнай часткі, дырэктара. Кіраўнікі арганізуюць калектыўнае наведванне, аналіз заняткаў, пазакласных мерапрыемстваў. Студэнты вывучаюць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

методыку падрыхтоўкі выкладчыкаў да ўрокаў, іх правядзення; работу аддзяленняў, прадметных кабінетаў; формы, метады пазакласнай работы па прадмеце.

У ходзе вучэбнай практыкі ў семестры студэнты знаёмяцца з навуковымі асновамі ўзаемадзеяння выкладчыка і вучняў, крытэрыямі развіцця асобы, метадамі комплекснай дыягностыкі. Яны выкарыстоўваюць прасцейшыя з іх дзеля вывучэння ўзроўню развіцця аднаго з навучэнцаў, пішуць характарыстыку, дыягнастуюць міжасобасныя зносіны вучняў класа (творчага калектыву). Па выніках дыягностыкі яны вучацца ставіць педагагічныя задачы, падбіраць педагагічныя сродкі для развіцця асобы вучня, яго якасцей і ўласцівасцей, фарміруюць навыкі планавання педагагічнай дзейнасці. Студэнты прысутнічаюць на ўроках, запісваюць назіранні ў дзённікі, наведваюць школьныя гурткі, рэпетыцыі калектываў.

Практыканты ў пісьмовым выглядзе абгрунтоўваюць сістэму сродкаў развіцця якой-небудзь уласцівасці, якасці асобы вучня на ўроку; складаюць план-канспект урока для рэалізацыі педагагічнай задачы праз сістэму сродкаў, план педагагічнага ўзаемадзеяння выкладчыка з вучнямі; праводзяць пробныя ўрокі або іх фрагменты ў 1-2 класах і выхаваўчыя мерапрыемствы.

II этап, 8 семестр:

— люты — установачная канферэнцыя;
— люты — май — вучэбная педагагічная практыка без адрыву ад навучальнага працэсу (17 тыдняў);
— май — другая рубежная абарона педагагічнай практыкі.

У гэты перыяд адбываюцца выпрацоўка індывідуальных педагагічных тэхналогій, рэалізацыя ў педагагічнай дзейнасці сродкаў вырашэння педагагічных задач. Студэнты выкарыстоўваюць сістэму методык дыягностыкі стану развіцця якой-небудзь уласцівасці асобы вучня, пішуць планы-канспекты, праводзяць урокі з вучнямі 3-4 класаў дзіцячай музычнай школы, складаюць метадычныя распрацоўкі, праводзяць пазакласныя мерапрыемствы па рэалізацыі канкрэтных задач.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

III этап, 9 семестр:

— верасень — установачная канферэнцыя; педагагічная практыка без адрыву ад навучальнага працэсу (4 тыдні);

— кастрычнік — лістапад — вучэбная педагагічная практыка з адрывам ад навучальнага працэсу (8 тыдняў);

— снежань — студзень — вучэбная педагагічная практыка без адрыву ад навучальнага працэсу (6 тыдняў);

— студзень — выніковая абарона педагагічнай практыкі.

На гэтым этапе практыканты прымаюць удзел у арганізацыі, ажыццяўленні педагагічнага працэсу, удасканальваюць індывідуальную тэхналогію, рэалізуюць сістэму сродкаў па вырашэнні педагагічных задач у дзейнасці з вучнямі выпускнога, 5 класа дзіцячай музычнай школы. Для гэтага дыягнастуюць стан развіцця вучняў класа (творчага калектыву), выяўляюць вучняў з нізкім узроўнем развіцця, складаюць іх комплексную характарыстыку, ставяць дамінуючую педагагічную задачу. Яны плануюць сістэму сродкаў, складаюць планы-канспекты, метадычныя распрацоўкі, вядуць урокі, пазакласныя мерапрыемствы, аналізуюць выніковасць педагагічнай дзейнасці.

На працягу ўсіх этапаў студэнты працуюць над курсавымі работамі па педагогіцы. Абарона іх адбываецца, як адзначалася вышэй, у семестры, можа спалучацца з правядзеннем выніковай канферэнцыі па педагагічнай практыцы. Найбольш грунтоўныя курсавыя работы перарастаюць у дыпломныя работы на атрыманне бакалаўрскай ступені (абарона адбываецца ў 9 семестры).

6. У змест заданняў па педагагічнай практыцы, як правіла, уключаюцца заданні даследчага характару. Такім чынам, навукова-даследчая работа студэнтаў у час практыкі мае працяг, завяршаецца правядзеннем анытанняў, фарміруючых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагагічных эксперыментаў. Асобныя, найбольш падрыхтаваныя практыканты могуць атрымаць творчыя заданні па вывучэнні, абагульненні педагагічнага вопыту, эксперыментаваць. Для кожнай групы студэнтаў вызначаецца дамінуючая педагагічная задача, якой падпарадкоўваюцца ўсе заданні па педагогіцы, псіхалогіі, методыцы: актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў, індывідуалізацыя, гуманізацыя працэсу навучання, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, асобасных рыс выкладчыка; асаблівасці пазнавальных працэсаў малодшых школьнікаў, спецыфіка арганізацыі выхаваўчай работы ў дзіцячай музычнай школе; выкарыстанне нагляднасці на ўроках па спецыяльнасці, праца з адстаючымі, псіхолага-педагагічныя асновы зносін выкладчыка і вучня, укараненне перадавога педагагічнага вопыту і інш. Творчыя заданні можна згрупаваць у 4 групы: а) асоба, вучэбны (творчы) калектыў; б) выхаваўчая і культурна-творчая дзейнасць; в) вучэбная і метадычная работа; г)вывучэнне і абагульненне педагагічнага вопыту.

Вынікі навукова-даследчай работы студэнтаў, атрыманыя ў час педагагічнай практыкі, прадстаўляюцца на студэнцкіх навуковых канферэнцыях, канферэнцыях па выніках практыкі. Яны знаходзяць адлюстраванне ў курсавых, дыпломных работах. Абарона педагагічнай практыкі па выніках выканання групавых творчых заданняў можа мець і выгляд тэматычнай справаздачы.

7. Далейшага вывучэння патрабуе пытанне формаў правядзення рубежных і выніковых канферэнцый па педагагічнай практыцы з улікам спецыфікі вучэбных прадметаў. Абарона педагагічнай практыкі можа праводзіцца ў два этапы.

На першым з іх практыканты прадстаўляюць камісіі сваіх вучняў, якія здаюць падрыхтаваную за семестр праграму (два рознахарактарныя творы і дуэт вучня з практыкантам) альбо праводзяць адкрыты (залікова) урок. Пасля гэтага студэнты дэманструюць веданне педагагічнага рэпертуару, уменне рабіць выканальніцкі аналіз 1-2 твораў, навыкі чытання з ліста.

На другім этапе можа быць праведзена кафедрай або факультэтам навукова-практычная канферэнцыя ці семінар з удзелам усіх практыкантаў і кіраўнікоў практыкі. Выніковая

канферэнцыя можа праводзіцца ў форме абароны курсавых работ. Студэнты прадстаўляюць вызначаныя ў праграме дакументы — дзённікі, характарыстыкі, планы-канспекты, метадычныя распрацоўкі, матэрыялы эксперыментальнай работы, наглядныя, дыдактычныя сродкі і інш. У вышэйшых педагагічных навучальных установах ёсць вопыт выкарыстання камп'ютэрнай тэхнікі для ацэнкі якасці адкрытых урокаў практыкантаў, псіхадыягностыкі вучняў у межах правядзення абароны педагагічнай практыкі.

8. Патрабуюцца пошукі па ўдасканаленні вядзення дзяржаўных экзаменаў па педагогіцы і методыцы выкладання для студэнтаў, якія не рыхтуюць дыпломнай работы. Экзамен павінен вызначыць не толькі ўзровень ведаў у галіне мастацка-педагагічнай дзейнасці, але і ўзровень сфарміраванасці педагагічных уменняў, асобасных якасцей будучага педагога. Улічваючы, што ў ходзе экзамену па спецыяльнасці дзяржаўная камісія ацэньвае перш за ўсё выканальніцкія ўменні, навыкі студэнтаў, мэтазгодным будзе ўключыць у білеты па педагогіцы і методыцы выкладання пытанні па тэорыі выканання для дыягностыкі ўзроўню тэарэтычных ведаў студэнтаў па сваім прадмеце. Такім чынам, у білеце будуць тры пытанні: першае — па педагогіцы або псіхалогіі, другое — па методыцы выкладання, трэцяе — па тэорыі выканання (прадмеце).

Важнай часткай дзяржэкзамену з'яўляюцца таксама правядзенне практычнага паказу фрагмента тэматычнага ўрока па спецыяльнасці, дэманстрацыя ведання і ўмення аналізаваць педагагічны рэпертуар. Для гэтага студэнт прадстаўляе спіс асвоеных ім 25 музычных твораў. Кожны з іх можа быць выкананы на памяць па жаданні камісіі. Гэтыя творы ўваходзяць у рэпертуар 5 класа дзіцячай музычнай школы, першага курса музычнага вучылішча.

Пры распрацоўцы адукацыйных стандартаў у падрыхтоўцы студэнтаў да будучай мастацка-педагагічнай дзейнасці трэба падкрэсліць важнасць уліку асаблівасцей кожнага ўдзельніка педагагічнага працэсу. Гэты ўлік магчымы ва ўмовах: падтрымкі педагагічнай творчасці, стварэння асяроддзя педагагічнага



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

пошуку; індывідуалізацыі заняткаў, варыятыўнасці, асобаснай скіраванасці зместу, сродкаў, форм, метадаў навучання; уключэння студэнтаў у прафесійна накіраваную творчую дзейнасць. Патрабуе практычнай апрабацыі ідэя стварэння аўтарскіх творчых лабараторый, майстэрань асобных выкладчыкаў для падрыхтоўкі будучых педагогаў-музыкантаў. У аснове гэтай ідэі — імкненне рэалізаваць на практыцы сістэму суб'ект-суб'ектных адносін, стварыць умовы самаразвіцця, прафесійна-педагагічнага самавызначэння студэнта.

Эфектыўнасць мастацка-педагагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў залежыць перш за ўсё ад арыентацыі дзейнасці арганізатараў педагагічнага працэсу на канчатковую мэту, ад увасаблення ва універсітэцкім асяроддзі мадэлі будучай прафесійна-педагагічнай дзейнасці ва ўсіх аспектах да спалучэння тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі студэнтаў на ўсіх этапах навучання. Таму такімі важнымі ўяўляюцца арганізацыя і правядзенне навуковых даследаванняў у вызначаных накірунках, аналіз і абагульненне вынікаў, шырокае ўкараненне іх у педагагічную практыку.

**Быстроў Г.А.,** дацэнт

## ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА ЯК СРОДАК ЯКАСНАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ

Педагагічную практыку студэнтаў факультэта мастацкай творчасці звычайна разглядаюць у кантэксце агульнай прафесійнай падрыхтоўкі. Як базы практыкі пры гэтым выступаюць музычныя школы, харавыя студыі, агульнаадукацыйныя школы, школы з музычным, харавым, харэаграфічным ухілам, гімназіі, вучылішча мастацтваў, музычны ліцэй. За гады вучобы, час практыкі ў будучых выкладчыкаў фарміруюцца матывы педагагічнай дзейнасці, псіхалагічная да яе гатоўнасць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ